# Да 60-годдзя утварэння СССР

Я. Р. РАДКЕВІЧ

## САВЕЦКАЕ РАДЫЁВЯШЧАННЕ ЯК АДЗІНАЯ СІСТЭМА

Сістэма савецкага радыёвяшчання ўяўляе сабой складанае адзінства, якое ахоплівае разнастайныя з'явы і развіваецца ў пошуку аптымальных форм жыццядзейнасці. У палітычнай структуры сацыялістычнага грамадскага ўкладу Краіны Саветаў кіруючай сілай з'яўляецца Камуністычная партыя. Партыйнае кіраўніцтва друкам, радыёвяшчаннем і тэлебачаннем забяспечвае паспяховую і ўзгодненую дзейнасць усіх відаў масавай інфармацыі. Для савецкага радыёвяшчання прынцып цэнтралізаванага кіраўніцтва ўвасоблены ў форме саюзна-рэспубліканскага дзяржаўнага камітэта, закліканага паўсядзённа накіроўваць дзейнасць уключаных у яго склад падраздзяленняў. Цэнтралізацыя дазваляе паспяхова ажыццяўляць тэхнічнае і творчае пераасnашчэнне ўсіх службаў Дзяржтэлерадыё, планамерна і няўхільна павышаць узровень вяшчання, аказваць рэгулярную метадычную дапамогу ўсім супрацоўнікам радыёвяшчання, аператыўна распаўсюджваць перадавы вопыт, праводзіць сумесныя арганізацыйна-творчыя мерапрыемствы (у якасці прыкладу можна прывесці Радыёдні савецкіх рэспублік на Усесаюзным радыё).

Але цэнтралізм сістэмы савецкага радыёвяшчання непадзельна звязаны з дэмакратызмам, які выяўляецца перш за ўсё ў яго набліжанасці да народных мас, у тым, што яно выказвае пачуцці і думкі грамадзян, прадастаўляе радыётрыбуну для выступленняў працоўных раёнаў, абласцей, рэспублік. Дэмакратызм сістэмы савецкага радыёвяшчання выяўляецца і ў свабодным, нічым не абмежаваным развіцці нацыянальных радыёвяшчальных праграм, якія рыхтуюцца на мове кожнай рэспублікі, кожнай нацыянальнай вобласці і акругі. Росквіт нацый і народнасцей Краіны Саветаў, абумоўлены многімі спрыяльнымі фактарамі, без усякіх сумненняў, забяспечваецца і наяўнасцю радыё на нацыянальных мовах, шырокай даступнасцю радыёпраграм, здольнасцю іх адлюстроўваць жыццё кожнага народа ў яго разнастайнасці, папулярызаваць усё лепшае, вартае ўвагі шырокай грамадскасці. Аператыўная інфармацыя аб палітычным, эканамічным і культурны жыцці, выступленні ў эфіры пісьменнікаў, вучоных, знаўцаў народнага слова, трансляцыі лепшых спектакляў нацыянальных тэатраў, перадачы народнай музыкі, фальклорных калектываў і многае іншае пастаянна садзейнічалі і садзейнічаюць развіццю нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры савецкіх народаў.

Савецкае радыёвяшчанне — унікальная сістэма, якая ўключае ў сябе ўсё багацце і шматгалоссе нацыянальных праграм і застаецца пры гэтым адзіным цэлым. Яе адзінства вызначана маналітнасцю шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржавы, агульнасцю сацыяльна-палітычных задач, нацыянальнай палітыкай партыі, якая ў поўнай меры ўлічвае жыццёвыя патрэбы кожнай нацыі, кожнай народнасці, што ўваходзяць у склад той новай гістарычнай агульнасці, якую мы называем савецкім народам.

У насельніцтва нашай краіны знаходзіцца 138,7 млн. радыёпрыемнікаў, радыёл і радыётрансляцыйных кропак. Сярэднесутачны аб'ём вяшчання ў цэлым па краіне склаў 1303,3 гадзіны, з іх 899 гадзін займаюць перадачы з саюзных і аўтаномных рэспублік, краёў, абласцей. Гэтыя перадачы вядуцца на 69 мовах народаў Савецкага Саюза [1]. Такія парамет-

ры сістэмы савецкага радыёвяшчання. Пры ўсіх сваіх вялізных памерах яна валодае аператыўнасцю, адладжанасцю і прыгнанасцю ўсіх састаўных частак.

Ужо на самым пачатку дзейнасці савецкага радыёвяшчання партыя звяртала ўвагу на пранікненне яго ва ўсе куткі вялізнай краіны, садзейнічала стварэнню нацыянальных радыёцэнтраў. Цяпер гэта работа накіравана на пастаяннае ўдасканаленне тэхнічных сродкаў перадачы і прыёму радыёпраграм, пашырэнне трансляцыйнай сеткі, на павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню вяшчання. У пастанове ЦК КПСС ад 30 студзеня 1967 года «Аб паскарэнні развіцця правадного вяшчання» сказана: «Камітэту па радыёвяшчанню і тэлебачанню... Саветам Міністраў саюзных рэспублік даручана забяспечыць трохпраграмнае радыёвяшчанне адпаведнымі праграмамі, маючы на ўвазе трансляцыю па першым канале першай агульнасаюзнай праграмы, па другім — праграмы «Маяк», па трэцім канале—перадач рэспубліканскіх, мясцовых і іншых найбольш цікавых і папулярных сярод насельніцтва праграм радыёвяшчання» [2]. Як бачым, нацыянальнаму і мясцоваму вяшчанню тут нададзена такая ж увага, як і цэнтральным праграмам. Структура савецкага радыёвяшчання мае неабходны ўзровень адпаведнасці структуры асноўных слухацкіх груп, які дае ёй магчымасць эфектыўна выказваць грамадскую думку розных слаёў насельніцтва, быць адным з сродкаў ажыццяўлення народнай улады, удзелу мас у фарміраванні палітыкі, у кіраванні грамадствам [3].

Савецкае радыёвяшчанне мае адзіную тэхнічную службу, што забяспечвае як адначасовую работу ўсіх радыёстанцый краіны, так і вяшчанне ўсіх рэгіянальных падраздзяленняў. За гады свайго існавання арганізацыйная структура савецкага радыёвяшчання неаднаразова карэкціравалася, перабудоўвалася, аднак важнейшы прынцып яе застаўся нязменны: цэнтралізацыя ідэалагічнага і агульна-метадалагічнага кіравання нароўні з развіццём творчай, нацыянальнай і рэгіянальнай своеасаблівасці радыёвяшчання. Гэты прынцып і забяспечвае ў канчатковым выніку вялізную жыццяздольнасць і эфектыўнасць сістэмы, дазваляе ёй чуйна адгукацца на змены ў знешнім свеце і пры неабходнасці перабудоўваць сваю работу.

Жыватворна дзейнічаюць на развіццё савецкага радыёвяшчання ўказанні Цэнтральнага Камітэта КПСС, якія ў рашаючыя перыяды гісторыі вызначалі магістральныя напрамкі вяшчання, садзейнічалі абнаўленню арганізацыйнаму і кадраваму, з'яўленню прагрэсіўных форм і метадаў работы. Так, калі мы гаворым аб значным паляпшэнні інфармацыйнай службы радыёвяшчання, прыкметным павароце да аналітычнасці многіх яго перадач у канцы 70—пачатку 80-х гадоў, то перш за ўсё адзначаем шэраг праграмных партыйных дакументаў, якія вызначылі гэтыя пазітыўныя зрухі. Гэта—прамовы Генеральнага Сакратара ЦК КПСС тав. Брэжнева Л. І. на лістападаўскім (1978) Пленуме ЦК КПСС і пры ўручэнні яму Ленінскай прэміі ў красавіку 1980 года, пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» (1979). Патрабаванні XXVI з'езда КПСС аб тым, што «кожны артыкул у газеце, кожную перадачу па тэлебачанню ці радыё трэба разглядаць як сур'ёзную размову з людзьмі, якія чакаюць не толькі праўдзівага і аператыўнага асвятлення фактаў, але і глыбокага іх аналізу, сур'ёзных абагульненняў» [4], нацэльваюць савецкіх журналістаў, у тым ліку і ўсіх творчых работнікаў радыё, на яшчэ больш адказны падыход да работы.

Прынцыпы пабудовы шматпраграмнага радыёвяшчання савецкіх рэспублік, згодна якім слухач можа выбраць агульнасаюзную праграму (на рускай мове), рэспубліканскую ці мясцовую (на нацыянальнай), ствараюць умовы для найбольш арганічнага злучэння матываў усвядомленай неабходнасці і абсалютнай добраахвотнасці пры авалоданні рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін у шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржаве.

Развіццё нацыянальных культур у нашай краіне адбываецца на аснове актыўнага ўзаемаўплыву, узаемапранікнення і ўзаемаўзбагачэння. У гэтым працэсе радыёвяшчанне адыгрывае не пасрэдніцкую ролю распаўсюджвальніка культурных каштоўнасцей, але само ўжо з першых год свайго існавання стала істотным фактарам нацыянальнай культуры кожнага народа, а ў цяперашні час інтэнсіўна садзейнічае стварэнню адзінай шматнацыянальнай культуры, дзе паспяхова вырашаецца пытанне аб дыялектычных суадносінах паміж нацыянальным і інтэрнацыянальным. Сістэма савецкага радыёвяшчання нясе на сабе адметныя прыкметы гэтага працэсу.

Такім чынам, у сістэме савецкага радыёвяшчання можна вылучыць наступныя рысы.

Дэмакратычны цэнтралізм як яе галоўны арганізацыйны прынцып прадугледжвае партыйнае кіраўніцтва ўсімі падраздзяленнямі сістэмы і прадвызначае структуру падпарадкаванасці ніжэйшых вышэйстаячым арганізацыям пры неабмежаванай творчай самастойнасці кожнага звяна і яго магчымасці прадстаўляць інтарэсы шырокай слухацкай аўдыторыі. У гэтым сэнсе савецкае радыёвяшчанне з'яўляецца сродкам «прамой сувязі», перадачы дырэктыўнай інфармацыі, а таксама сродкам «зваротнай сувязі», выяўляючы адносіны мас да рашэнняў партыі і дзяржавы.

Шматнацыянальнае, шматмоўнае па сваім складзе, савецкае радыёвяшчанне ўяўляе сабой цэльны ідэалагічны інстытут партыі з адзінымі прапагандысцкімі і выхаваўчымі задачамі і нацыянальнымі асаблівасцямі яго падсістэм. Кожная з падсістэм, з'яўляючыся фактарам нацыянальнай культуры, садзейнічае усебаковаму яе развіццю з тым, каб паўней увасобіцца ў адзінай шматнацыянальнай сацыялістычнай культуры. Шматпраграмная пабудова радыёвяшчання савецкіх рэспублік дае слухачу роўныя магчымасці для ўспрыняцця агульнасаюзных і мясцовых (нацыянальных) праграм.

Сістэма савецкага радыёвяшчання, арганізацыйна аформленая у саюзна-рэспубліканскі Дзяржкамітэт, валодае выключнай мабільнасцю і аператыўнасцю пры пераключэнні ўсіх вяшчальных каналаў на адну цэнтральную праграму ў момант перадачы экстраных, асабліва важных паведамленняў. У той жа час прынцып шматпраграмнасці дазваляе адначасова весці вяшчанне для самых розных рэгіёнаў, што ў канчатковым выніку забяспечвае аўдыторыю самай разнастайнай інфармацыяй, задавальняе запатрабаванні розных груп насельніцтва.

Усе падраздзяленні савецкага радыёвяшчання маюць магчымасць выходзіць у эфір на больш высокім іерархічным узроўні. Гэта з'яўляецца добрай школай прафесіяналізму для ўсіх падраздзяленняў і садзейнічае павышэнню якасці ўсяго савецкага вяшчання.

Савецкае радыёвяшчанне, з'яўляючыся адным з відаў масавай інфармацыі краіны, мае відавую аднароднасць, якая вызначаецца перш за ўсё наяўнасцю спецыфічных сродкаў адлюстравання рэчаіснасці. Да іх адносяцца слова, якое гучыць, шумы, якія даюць акустычную карціну жыцця, музыка і шэраг тэхнічных сродкаў увасаблення матэрыялу ў перадачу. Акрамя таго, радыё выгадна адрозніваецца ад іншых сродкаў масавай інфармацыі выключнай прастатой прыёму перадач, паўсюднасцю іх, здольнасцю асіміліравацца з асабістым вопытам слухача.

Адзіныя тэхнічныя каналы сувязі значна спрашчаюць працэс тыпалагізацыі савецкага радыёвяшчання. Агульнасць палітычных і ідэалагічных задач, якія з'яўляюцца галоўнымі, вызначальнымі, зводзіць тыпалогію вяшчання да выяўлення двух узроўняў у залежнасці ад рэгіянальных (нацыянальных) прыкмет (вертыкальны ўзровень) і адрасных, прафесійных, функцыянальных (гарызантальны ўзровень). Структура савецкага радыёвяшчання павінна разглядацца з улікам розных узроўняў, бо з'яўляецца складаным адзінствам — вынікам працяглага развіцця, доўгіх год пошукаў і знаходак.

[1] Гл.: День радио.— М., 1980, с. 5.
[2] О партийной и советской печати, радиовещании и телевидении.— М., 1972, с. 553—554.
[3] Гл.: Журналистика в политической структуре общества.— М., 1975, с. 52.
[4] Матэрыялы XXVI з'езда КПСС.— Мінск, 1981, с. 78.

В. П. КРАСНЕЙ

## ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ Ў САВЕЦКІ ЧАС

Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў савецкі час — яскравае сведчанне ўсебаковага росквіту творчых магчымасцей беларускай нацыі, калі да актыўнага грамадскага жыцця і творчай дзейнасці далучыліся разняволеныя працоўныя масы.

Яшчэ ў дакастрычніцкія часы У. І. Ленін і заснаваная ім бальшавіцкая партыя, распрацоўваючы на марксісцкай аснове складаныя праблемы нацыянальна-моўнай палітыкі, абвясцілі права прыгнечаных царызмам на-